

Крокамі шматмільённымі, на зьмену зьмене, шагай шпарчэй, піонэрская раць!

Пролетары ўсіх краін, злучайцеся!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 170 (1439) | СУБОТА, 25 ліпеня 1931 г.

ДА ДРУГОГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА

Да 2-га ўсебеларускага зьлёту юных піонэраў піонэрская організацыя Беларусі прыходзіць са значнымі посьпехамі. Піонэр-організацыі Беларусі ў асноўным павярнулася тварам да задач соцыялістычнага будаўніцтва, дасягнула конкрэтных вынікаў у барацьбе за прамфінплян і перабудову сельскай гаспадаркі.

Дамо слова фактам

Піонэр-організацыя Рагачэўшчыны ў вясеньня-пасеўнай кампаніі адпрацавала ў колгасах і саўгасах 8908 працадзён, пратруціла і ачысьціла 4048 кілёграм насеньня васеялі 25 га лесу.

На швейнай фабрыцы (Бабруйск) піонэрамі сабрана 79 рабочых прапаноў, з іх пад непасрэдным кантролем піонэр-атраду рэалізавана 66, што дае 20 тысяч эканоміі ў год.

Растуць і рады піонэр-організацыі.

Буда-Кашалеўская піонэр-організацыя за апошнія 6 месяцаў узрасла з 405 чал. да 727 чал. Організавана сельска-гаспадарчая даследчая дзіцячая станцыя, распаўсюдзілі пазыкі на 1435 р.

Багушэўская піонэр-організацыя: к 1-му зьлёту піонэрскіх атрадаў было 12, а піонэраў 426. Зараз атрадаў—30, піонэраў—1578.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб усё ўзрастаючай актыўнасьці працоўнай дзетвары і павароту значнай часткі раённых піонэр-організацый да задач соцыялістычнага будаўніцтва.

Яны сьведчаць аб тым, што ў гэтых раёнах комсамольскае кіраўніцтва, камітэты, ячэйкі зразумелі сутнасьць рашэньняў IX і X зьездаў, забясьпечылі піонэр-організацыю сапраўднымі бальшавіцкімі кадрамі і штодзённым кіраўніцтвам.

Плады опортуністычных кіраўнікоў

Аднак рад організацый Беларусі прыходзіць к другому зьлёту з ганебнымі лічбамі.

Сіроцінская піонэр-організацыя ня здолела выканаць наказ 1-га зьлёту. За апошні час піонэр-атрады амаль не працуюць. Організацыя ня здолела стаць начале ўзрастаючай актыўнасьці працоўнай дзетвары. Але, ня гледзячы на гэта, асобныя атрады гэтага-ж раёну, як напрыклад, атрады Лужанскай базы праводзілі самі сходы па колектывізацыі і ўцягнулі ўсіх сваіх бацькоў у колгас. Гэты факт гаворыць сам за сябе. Ні комсамольская ячэйка, ні райбюро ДКО ня кіруюць гэтай узрослай актыўнасьцю, па сутнасьці губяць ініцыятыву дзяцей.

Ня лепш абстаіць справа ў Ветрынскім р-не. Тут гаракіраўнікі не ведаюць колькі атрадаў у раёне, ніхто ня ведае аб дагаворы, заключаным з Наркомземам.

Аб чым можа гаварыць той факт, што на райзьлёце піонэраў Расоншчыны, замёст таго, каб прыняць конкрэтныя пастановы, забясьпечваючыя аздараўленьне работы піонэрорганізацыі, заслухалі тры даклады і на ўсіх трох прынялі адну пастанову, у якой прызнаюць толькі што райбюро ДКО і піонэр-організацыя не працавалі, ці былі на гэтым зьлёце прадстаўнікі РК партыі і комсамолу і што яны там рабілі—нам невядома.

Даць піонэрам кіраўнікоў-ударнікаў

Раённыя комітэты і ячэйкі у большасьці сваёй яшчэ не зрабілі павароту тварам да піонэр-організацыя. Якасны склад павадыроў атрадаў не адпавядае рашэньням IX і X зьездаў комсамолу. У большасьці атрадаў павадырамі зьяўляюцца комсамольцы са стажам з 1930—31 г. Зразумела, яны ў сваёй большасьці ня могуць забясьпечыць належнага кіраўніцтва піонэр-атрадамі. Таму рашаючым момантам, без чаго немагчыма далейшае палепшаньне піонэр-працы, зьяўляецца забесьпячэньне піонэр-організацыі неабходнай колькасьцю і высокай якасьці кіраўнікамі.

Наша зьмена павінна стаць шматмільённай

IX зьезд паставіў конкрэтную задачу—ахапіць ў бліжэйшыя гады 100 проц. дзяцей рабочых, батракоў, колгасьнікаў, беднякоў піонэр-організацыяй. Гэтае рашэньне зьезду выконваецца вельмі марудна. ЛКСМБ з часу зьезду ўзрасла на 34 тысячы чалавек, а піонэр-організацыя на 60 тысяч.

Такі рост пры ўмовах узрослай актыўнасьці пролетарскай дзетвары не дапушчальны—ён не забясьпечвае ператварэньня піонэр-організацыі ў шматмільённую.

Тэмпы росту піонэр-організацыі павінны быць павышаны. Трэба ўзмацніць комсамольскае ядро ў піонэр-атрадах.

Павярнуць піонэр-організацыю тварам да конкрэтных задач соцыялістычнага будаўніцтва, ператварыць яе ў шматмільённую організацыю, забясьпечыўшы яе кіраўніцтвам праверэных комсамольцаў і адпаведным комсамольскім ядром. Такавы задачы, выходзячыя з рашэньняў IX і X зьездаў КСМ.

Гэтыя задачы будуць выкананы толькі пры ўмове рашучай барацьбы з опортуністычнай недаацэнкай дзіцячага комуністычнага руху, пры ўмове, калі ў кіраўніцтва піонэр-організацыяй мы вылучым лепшых ударнікаў, праверэных комсамольцаў.

Фіалкін.

Зьлёт пасьлякастрычнікаўскага пакаленьня

У гісторыі дзіцячага комуністычнага руху Беларусі 2-гі зьлёт трэцяга пакаленьня, зьлёт слаўнай зьмены ленінскага комсамолу адчыняе новую старонку.

Два гады, якія мінулі з часу першага ўсебеларускага зьлёту піонэраў былі запоўнены ўпартай і настойлівай работай. Піонэрская організацыя пад кіраўніцтвам партыі і ленінскага комсамолу за гэты час дабілася значных дасягненьняў. Калі, прыкладна, да першага зьлёту ў піонэр-органазацыі налічвалася—79.541 піонэраў, а да X усебеларускага зьезду КСМ (студзень 1931 г.)—95.667, дык зараз налічваецца 155.036 піонэраў.

Разам з колькасным ростам, з кожным днём расла і мацнела піонэрская організацыя якасна. Бязумоўна гэты якасны рост вынікае з росту актыўнасьці рабочае клясы, з росту соцыялістычнага будаўніцтва.

Піонэрская організацыя ў асяродак свае ўвагі зараз ставіць пытаньне конкрэтнай дапамогі партыі і комсамолу ў разгорнутым соцыялістычным будаўніцтве. Аб гэтым красамоўна сьведчыць работа піонэрскіх атрадаў: па выкананьню і перавыкананьню прамфінпляну, па дапамозе КСМ у пераводзе брыгад, цэхаў на гаспадарчы разрахунак, па тэхніцы, політэхнізацыі, колектывізацыі удзелу ў правядзеньні ўборачнай, хлебазагатовак, па ўсеагульнаму навучаньню і г. д.

Другі ўсебеларускі зьлёт склікаецца ў надзвычайна адказны гістарычны пэрыод. У пэрыод—разгорнутых работ па выкананьню задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі, работ па завяршэньню пабудовы фундаманту соцыялістычнай эконокіі. Гэта ўскладае асаблівую адказнасьць на трэцяе пакаленьне—юных ленінцаў, абавязвае абагуліць праз зьлёт вопыт работы з часу першага зьлёту, распаўсюдзіць у організацыю лепшыя пачынаньні, мобілізаваць усю піонэрыю, усю пролетарскую дзетвару на барацьбу за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Барацьба піонэрорганізацыі і усёй пролетарскай дзетвары за сваечасовы пуск 518 і 1040 гігантаў соцыялістычнай індустрыі, дапамога партыі, комсамолу ў правядзеньні колектывізацыі, хлебазагатовак, у пераварэньні Савецкай Беларусі ў край суцэльнай пісьменнасьці, ператварэньне піонэр-організацыі ў шматмільённую організацыю—чарговыя і баявыя задачы піонэр-організацыі ў сучасны пэрыод.

Ленінскі комсамол—непасрэдны кіраўнік і організатар піонэр-організацыі, адказвае перад партыяй і пролетарскай грамадзкасьцю за выхаваньне трэцяе бальшавіцкае зьмены. Ён павінен забясьпечыць выкананьне гэтых задач поўнасьцю. Аднак у радзе месц комсамольскія організацыі патрэбнай увагі на работу піонэр-атрадаў не зьвяртаюць. Асобныя ячэйкі недаацэньваюць работу сярод піонэраў, не цікавяцца ёй, вылучаюць непадрыхтаваных і непадыходзячых да работы з піонэрамі комсамольцаў.

Толькі што прайшоўшая паласа раённых зьлётаў піонэраў, як падрыхтоўка гэтай да усебеларускага зьлету—з усёй выразнасьцю сьведчыць аб гэтым. У радзе раёнаў зьлёты праведзены яўна нездавальняюча, без належнай падрыхтоўкі, бяз ўдзелу пролетарскай грамадзкасьці.

Такія адносіны да піонэр-організацыі толькі садзейнічаюць клясаваму ворагу у яго барацьбе за дзетвару, за моладзь.

У кіраўніцтве піонэр-організацыяй неабходна зрабіць рашучы пералом. Неабходна безадкладна ажыцьцявіць рашэньні IX-га ўсесаюзнага, X-га ўсебеларускага зьездаў комсамолу аб рабоце піонэр-організацыі.

Шматмільённаму ленінскаму комсамолу павінна быць падрыхтавана надзейная шматмільённая зьмена. Гэта будзе зьдзейсьнена толькі пры ўмове ўважлівых адносін да піонэр-організацыі.

Сто пяцідзесяціпяцітысячная армія пасьля кастрычнікаўскага пакаленьня—юныя піонэры з трыбуны зьлёту павінны будуць рапартаваць партыі, комсамолу і ўсёй грамадзкасьці аб барацьбе і посьпехах у сваёй рабоце, рабоце па-новаму, па выхаваньню і фармаваньню пад кіраўніцтвам партыі новае соцыялістычнае грамады.

Зьлёт

Зьмітро Вітамін

Што ня зробяць сягоньня бацькі—
Зробіць заўтра юнае племя...
—
Цягнік,
цягнікі,
цягнікі
З вяскавейшымі ўнукамі Леніна...
Цягнікі...
І гэтак ці па-іншаму
Сустракае іх сёньня вакзал.
Ён дзьвярыма рыпіць:
— Гэта нашыя—
Яны маюць пра што расказаць...
У краіне грымяць пабудовы,
Усё старое
ідзе на злом.
Над краінаю радаснай,
новай
Будаўнічае сонца ўзышло.
Вось будуецца дом.
Прыглядзіся:
Там чырвоныя гальштукі,
Там!
Яны лёзунгі пішуць:
„Людвісія
На пятнаццаць адсоткаў адстаў..."
„Вон з будовы прагульшчыка,
п'яніцу!.."
„Выграць Зуба Пятра,
ён рвачі.."
І растуць муры,
і румяняцца,
І хiлее жыцьцём галава...
І дзе звоніць ячмень каласамі,
Дзе гамоніць з вадой трасьнікі,
Тыя-ж самыя там,
тыя-ж самыя
Воч яснота
і вернасьць рукі,..
З Мазыра,
Амсьціслаўля,
Лепеля —
Ад варштатаў
колгасных весьніц
Прыехалі на зьлёт
найлепшыя
Будучыні
буравесьнікі!



НЕ МЭХАНІЧНАЙ ВЯРБОЎКАЙ, А ЎЗМАЦНЕНЬНЕМ РАСТЛУМАЧАЛЬНА-МАСАВАЙ РАБОТЫ
ПЕРАТВОРЫМ КОМСАМОЛ У ШМАТМІЛЬЁННЫ
„Справа ня толькі ў колькасьці, а галоўным чынам у якасьці"

За апошні час наша комсамольская організацыя Беларусі дасягнула буйных посьпехаў у росьце організацыі.

Аднак, у асноўным і зусім правільным разгортваньні барацьбы за шматмільённы комсамол, у радзе комсамольскіх камітэтаў наглядаюцца факты скажэньня росту, якое выходзіць з неразуменьня асноўнага, што пераўтварэньне комсамолу ў шматмільённы не зьяўляецца самамэтай, а сродкам узмацненьня ўплыву партыі на шырокія колы працоўнай моладзі і павышэньня ўдзелу комсамолу на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва.

І менавіта такім скажэньнем патрэбна лічыць факты, калі шырокая масава-растлумачальная праца падмяняецца нездаровай пагоняй за лічбамі, калі індывідуальны адбор падмяняецца мэханічнай вярбоўкай. Такія факты мы маем на шчотачнай фабрыцы (Менск) і другіх організацыях. Замест упартай працы па вярбоўцы даюцца лічбовыя разьвёрсткі. Такія факты маюцца ў Боркавіцкай організацыі, дзе далі разьвёрстку ўзрасьці з 400 да 1000 чалавек і інш.

ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове катэгорычна асудзіў гэтыя скажэньні. Усе комсамольскія організацыі абавязаны ўзмацніць сапраўды масавую растлумачальную работу па ўцягненьню рабоча-батрацкай і перадавой часткі колгаснай моладзі ў КСМ на аснове індывідуальнага адбору, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на замацаваньне навічкоў, шляхам уцягненьня ў грамадзка-вытворчую працу, на ўзмацненьне пролетарскага і партыйнага ядра. Справа ня ў колькасьці, а галоўным чынам у якасьці прымаемых у КСМ.

Пад знакам такой устаноўкі і пры рашучай перамозе скажэньняў у росьце, мы абавязаны выканаць рашэньні IX зьезду аб 100 проц. ахопе рабоча-батрацкай і перадавой колгаснай моладзі комсамолам.

Усім організацыям УсеЛКСМ

Цэнтральны камітэт УсеЛКСМ зварочвае ўвагу ўсіх камітэтаў і ячэек комсамолу на тое, што ў радзе організацый комсамолу за апошнія тыдні назіраецца ў практыцы [illegible] па росту саюзу нездаровая пагоня за голай лічбай, падмяняецца масавая работа і індывідуальны адбор мэханічнай вярбоўкай, устанаўленьнем разьвёрстак.

Між тым, наш саюз заўсёды праводзіў і праводзіць уцягненьне ў рады комсамолу толькі на аснове індывідуальнага адбору, ня раз рашуча асуджаючы ўсялякія факты агульнай і мэханічнай вярбоўкі. Асуджаючы маючыяся месца скажэньні ў практыцы росту, Цэнтральны камітэт УсеЛКСМ прапануе ўсім камітэтам і ячэйкам комсамолу ўсямерна ўзмацніць масавую работу, забясьпечыўшы здаровы рост саюзу за лік рабочай, батрацкай і перадавой колгаснай моладзі, і стварэньне ячэек комсамолу пры кожным колгасе і саўгасе, рашуча не дапускаючы перагібаў і скажэньняў у росьце саюзу, цьвёрда памятаючы, што справа ня толькі ў колькасьці, але галоўным чынам у якасьці.

Задача, пастаўленая IX-м Усесаюзным зьездам УсеЛКСМ аб пераўтварэньні комсамолу ў шматмільённую організацыю, азначае перш за ўсё падвышэньне дзейнасьці ленінскага комсамолу на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, узмацненьне ўплыву партыі ў шырокіх масах працоўнай моладзі, якаснае ўмацаваньне радоў ленінскага комсамолу і падвышэньне ролі і ўдзельнай вагі пролетарскага ядра ў саюзе.

У адпаведнасьці з гэтай задачай неабходна ўсім ад[illegible] саюзу разгарнуць масавую работу на [illegible] уцягненьню ўсёй [illegible] уступаючых у рады комсамолу ў грамадзка-палітычнае і гаспадарчае жыцьцё, замацоўваючы іх на гэтай аснове, выхоўваючы ў ленінскім духу і ўцягваючы новыя кадры рабочае і працоўнае моладзі ў рады комсамолу.

Цэнтральны Камітэт УсеЛКСМ

Па-баявому

Уноў організаваная ячэйка колгасу „Савецкая Беларусь" (Заванчацкага сельсавету Клімавіцкага раёну), зараз па-баявому разгарнула работу па ўцягненьню колгаснай моладзі ў шэрагі комсамолу.

Па ўсіх аддзяленьнях колгасу створаны брыгады, якія апрацоўваюць і падрыхтоўваюць моладзь для паступленьня ў комсамол.

Пры ячэйцы створаны 2 гурткі гурток бягучай палітыкі па прапрацоўцы статуту і програмы УсеЛКСМ для навічкоў і б-п колгаснай моладзі.

У аддзяленьні колгасу „Савецкая Беларусь", вёскі Зьвянчаткі, брыгадай уцягнута ў комсамол 9 асоб.

Трэба адзначыць, што вялікую дапамогу па гэтаму пытаньню аказвае рэдколегія комсамольскай насьценгазэты „За шматмільённую комсамолію", якая арганізавала брыгады сьцяўкораў па правядзеньню гэтай работы.

Брыгадзір „Чырвонай Зьмены" П. Карнеенка.

Пішуць калектыўную заяву аб прыёме ў КСМ

Сёмы агрэгат акомсамолены

Сёмы агрэгат ФЗВ імя КІМ'у ў зьвязку з пастановай трэцяга кантрольнага пленуму ЛКСМБ аб пераўтварэньні ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю, з асобнымі пераўтвараецца ў комсамольскі агрэгат. З 48 працоўных—47 комсамольцаў. 7-мы агрэгат.

Разгарнуць шырока культурна-масавую работу

Вынікі праверкі выкананьня пастановы IX-га і X-га зьездаў, 2-га і 3-га кантрольных пленумаў ЦК УсеЛКСМ і ЦК ЛКСМБ аб пераўтварэньні ленінскага комсамолу ў шматмільённую організацыю, шырока абгаварвана на бюро комсамольскага колектыву ФЗВ „КІМ" на агульных сходах комсамольскіх ячэек разам з беспартыйнай моладзьдзю.

Для практычнага ажыцьцяўленьня пастаноў кантрольных пленумаў комсамолу па росту была вылучана група комсамольцаў для правядзеньня работы па акомсамольваньню агрэгатаў.

На ўсіх агрэгатах былі праведзены гутаркі аб шматмільённым комсамоле, вынікам чаго: 15-га ліпеня прынята 28 чалавек, 16-га ліпеня—27, 17-га—9, 18-га—20, 19-га—53, 20-га—29, 21-га—20, 22-га—12 чалавек.

За 8 дзён ударнае працы мы ўцягнулі 198 чалавек і ў сучасны момант у нас налічваецца 434 комсамольцы і 159 беспартыйнай моладзі.

З 159 беспартыйных большасьць знаходзіцца ў інтэрнаце, дзе слаба разгорнута культурна-масавая работа, а таму і слабы рост за лік жывучых у інтэрнаце. Комсамольскі колектыў зараз прыкладае ўсе сілы і ўсю ўвагу для таго, каб шляхам шырока разгорнутай культурна-масавай работы ўцягнуць усю рабочую моладзь у комсамол.

Комсамольскі колектыў узяўся за палепшаньне работы сярод жывучых у інтэрнаце, організоўваючы паходы ў кіно, гутаркі, дыспуты па прагледжаных фільмах і г. д.

Кожны дзень мы на чырвонай дошцы вывешваем зводкі ходу росту нашага колектыву. У выніку ўсёй гэтае работы ўжо маецца 8 акомсамоленых агрэгатаў.

Але тут нельга абыйсьці міма [illegible] факту, што [illegible] колектыў не [illegible] з навічкамі належнае работы.

Наша задача, асабліва зараз, узмацніць работу з навічкамі, разгарнуць палітычна-масавую работу і на аснове індывідуальнага прыйму акомсамоліць ФЗВ.

С. Гольдзін.

Вынік опортуністычнай дзейнасьці
Тав. Варонін, ты адказваеш за такое становішча росту

У м. Капылі маецца 6 ячэек КСМ, але ніводная з іх не працрапавала і ня ведае пастаноў ЦК аб росьце комсамолу.

У Капылі маецца МТС, тут шмат рабочай моладзі. Усе трактарыстыя комсамольскага ўзросту, але дзякуючы адсутнасьці масавай працы, сярод іх зусім мала комсамольцаў. Таксама нічога ня робіць па росту другая ячэйка пры МТС, якая складаецца з студэнтаў-практыкантаў політэхнікуму. Яны зусім адмежаваліся ад рабочых МТС і ніякай працы не вядуць.

Ня лепш працуе ячэйка пры райкомбінаце. На комбінаце працуе значная частка рабочай моладзі, але ніхто з імі працу па ўцягненьню ў КСМ не праводзіць.

У Капыльскім колгасе імя Варашылава налічваецца каля 30 чал. моладзі, з іх усяго 6 комсамольцаў.

Такое становішча ў росьце тлумачыцца яўным ігнараваньнем гэтымі ячэйкамі рашэньняў зьезду комсамолу, опортуністычнай стаўкай на самацёк.

Раённы камітэт, пад бокам якога знаходзяцца гэтыя ячэйкі, ніякіх мерапрыемстваў не прыняў па палепшаньню работы, што сьведчыць аб опортуністычнай практыцы ў рабоце самога бюро райкому ЛКСМБ, сакратаром якога зьяўляецца тав. Варонін.

К. Б.

Дамо Чырвонай політычна-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне

ВЫХОДЗЬЦЕ ВА УСЕБЕЛАРУСКІ „ЧЫРВОНАЗЬМЕНАЎСКІ" РЭЙД
Баявымі справамі паходу будзем рапартаваць Рэўваенсавету БВА—нашаму арбітру ў соцспаборніцтве з „Большевистским Молодняком"

Больш месяца таму назад ЦК ЛКСМБ у адказ на адозву Рэўваенсавету БВА абвясьціў паход беларускай комсамоліі за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА імя трэцяга, рашаючага году пяцігодкі. Гэты паход яшчэ на мае патрэбнага размаху. У цэлым радзе раёнаў комсамольскія організацыі яшчэ не разгарнулі баявой работы па выкананьню сваіх абавязкаў перад РСЧА.

Патрэбны энэргічныя меры для таго, каб гэтаму паходу надаць бальшавіцкі разгон, каб выканаць вялізарныя задачы політычна-сьвядомага і пісьменнага папаўненьня РСЧА.

Адным з такіх сродкаў, адным з стымулаў для баявога разгортваньня паходу павінен зьявіцца ўсебеларускі рэйд ударнікаў—„Чырвоназьменаўцаў", які праводзіцца ў міжнародны Чырвоны дзень—1-га жніўня. Комсамольскія камітэты, паводле дырэктывы ЦК ЛКСМБ, абавязаны забясьпечыць баявое правядзеньне рэйду, павінны мобілізаваць „Лёгкую кавалерыю" і армію культармейцаў для актыўнага ўдзелу ў ім.

Тэлеграма, атрыманая ўчора „Чырвонай Зьменай" ад Рэўваенсавету [illegible] для ўсёй арміі ўдар[illegible]—„Чырвоназь[illegible] мобілізуючым сродкам на яшчэ больш ударную і рашучую барацьбу за выкананьне грандыёзных задач прызыву.

Ітак, комсамолія, юнкоры, кавалерыстыя, культармейцы, выходзьце ва ўсебеларускі „Чырвоназьменаўскі" рэйд, выходзьце на яшчэ больш рашучую барацьбу за політычна-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА трэцяга, рашаючага!

З штабу БВА. 1332
24-га ліпеня, 20 гадзін, 0 хвілін
Менск, рэдакцыі „Чырвонай Зьмены"

Рэўваенсавет акругі са здавальненьнем адзначае вашу работу па прызыву.

Вашаму прыкладу павінны пасьледваць усе раённыя газэты БССР і „Большевистский молодняк" Запобкому.

Бальшавіцкім мэтодам--за клясава-аддаднага прызыўніка—ударніка колгасу і заводу, за саракапроцантную комсамольскую праслойку прызыву.

Камандуючы войскамі Зонбэрг.

Член Рэўваенсавету Каробаў.

СЛУХАЙ „ЧЫРВОНАЗЬМЕНАВЕЦ"

„Чырвоная Зьмена" 1-га жніўня праводзіць усебеларускі рэйд ударнікаў сваёй газэты. У гэты рэйд уключаецца ўся комсамолія БССР.

Табе неабходна пад кіраўніцтвам ГК ці РК ЛКСМБ, у цеснай сувязі з Райваенкаматам, актыўна ўдзельнічаць у гэтым рэйдзе, быць сапраўдным ударнікам.

Мэта рэйду—высьветліць, як мясцовыя організацыі (ЛКСМБ, профсаюзныя, АСО-авіяхэмаўскія, т-ва „Прэч няпісьменнасьць", ІНА і г. д.) змагаюцца за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне Чырвонай арміі.

Вось прыкладная памятка, па якой трэба праводзіць усебеларускі рэйд.

1. Як мобілізавана савецкая грамадзкасьць на пасьпяховае забясьпечаньне РСЧА клясава-сьвядомым і пісьменным папаўненьнем (ці разгорнута вакол гэтай політычнай кампаніі масавая работа, ці былі сходы, нарады па пытаньню прызыву сярод комсамольцаў, рабочай, колгаснай і бядняцка-серадняцкай аднаасобніцкай моладзі, сярод дарослых працоўных тваёй мясцовасьці).

2. Як мобілізоўваць грамадзкасьць насьценгазэты, шматтыражкі і раённыя газэты на пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых Рэўваенсаветам?

3. Як працуюць камісіі па адсеву клясава-чужых элемэнтаў, (ці разгарнулі яны масавую работу, ці прыцягнута да ўдзелу ў іх рабоце пролетарская грамадзкасьць).

4. Як працуюць лікпункты па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў, ці мобілізаваны культармейцы на хутчэйшае ажыцьцяўленьне гэтай задачы.

5. Ці ведаюць прызыўнікі і працоўныя, што ў гэтым годзе прызыўнікі прызываюцца па месцы сваёй працы. Ці былі на гэтую тэму гутаркі і сходы, ці замацоўваліся прызыўнікі на працы да апошніх дзён адпраўкі ў часьць.

6. Ці ёсьць у вашым цэху, заводзе, колгасе і саўгасе паказальныя ўдарныя брыгады прызыўнікоў 1909 году нараджэньня, ці ёсьць ударныя брыгады імя прызыву трэцяга, рашаючага году пяцігодкі.

7 Як змагаецца комсамол за 40 проц. комсамольскую праслойку сярод прызыўнікоў?

8. Як рыхтуецца раён да провадаў (чым думаюць адзначыць дзень уходу прызыўнікоў у армію—чырвоным абозам і г. д.).

ГК і РК ЛКСМБ, „чырвоназьменаўцы", не абмяжоўвайцеся гэтым колам пытаньняў. У працэсе рэйду ў вас паўстануць яшчэ рад новых пытаньняў.

Выкрывайце конкрэтных носьбітаў зла.

Там, дзе вы сустрэнеце дрэнную пастаноўку работы ў падрыхтоўцы да прызыву трэцяга рашаючага году, дапамажыце практычна конкрэтнай работай наладжваньню гэтай справы.

„Чырвоная Зьмена".

У ІХ ЁСЬЦЬ ЧАМУ ПАВУЧЫЦЦА

На заводзе „Комунар" (Менск) з агульнага ліку прызыўнікаў 1909 г. 27 проц. няпісьменных і малапісьменных.

Колектыў ЛКСМБ за ўдарным нарадку распачаў працу з прызыўнікамі.

У хуткім часе склікаецца сход рабочых 1909 году нараджэньня. На сходзе будуць стаяць пытаньні—аб задачах прызыву 1909 г., аб ходзе ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікаў заводу. Зараз на заводу ідзе праверка, хто з прызыўнікоў і ў якой меры ўладае пісьменнасьцю. Організуецца гурток па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Заняткі пачнуцца праз тры дні.

В. К.

ЗНОЎ У РОЛІ ДАЛАКОПАЎ

Па віне ВСНГБ і Наркампрацы зрываецца ліпеньскі набор у ФЗВ

Тэрмінова ліквідаваць прарыў, пачаць падрыхтоўку да зімовага набору

Паводле пастановы ЦК ЛКСМБ у ліпеньскі набор ФЗВ павінна было быць прынята 800 чалавек. ВСНГБ вызначыў лічбу ў 500 чалавек. На сёнешні дзень набрана ўсяго 90 асоб.

Зрыў ліпеньскага набору, як і зімовага (мінулага году) тлумачыцца тым, што ВСНГБ і асобныя комсамольскія організацыі ня здолелі па-сапраўднаму падрыхтавацца да яго правядзеньня, а Наркампрацы, працуючы старымі мэтодамі, на забясьпечыў вярбоўкі падлеткаў ФЗВ.

Як ВСНГБ, так і Наркампрацы не зрабілі для сябе належных вынікаў ад правалу зімовага набору ў ФЗВ.

Трэба скарыстаць апошнія дні ліпеня, каб поўнасьцю правесьці набор. Больш гнуткасьці і опэрацыйнасьці патрэбна апарату Наркампрацы, больш увагі павінны ўдзяліць гэтаму пытаньню мясцовыя комсамольскія організацыі, а ВСНГБ павінен заняцца выкананьнем сваіх пастаноў у гэтым напрамку.

Адначасова патрэбна зараз-жа прыступіць да капітальнага будаўніцтва і падрыхтоўкі да правядзеньня зімовага набору.

Пастанова ўраду аб першачарговым будаўніцтве школ ФЗВ павінна быць выканана ўсімі організацыямі.

Комсамол павінен дабіцца выкананьня гэтага рашэньня і зараз-жа пачаць падрыхтоўку да зімовага набору.

Кантрольныя лічбы ня выкананы

У ліпеньскі набор ФЗВ павінна было быць прынята 500 чалавек. На Мэталяаб'яднаньню—105 чалавек, Будаб'яднаньню—140, Тэкстыльаб'яднаньню—70, Швэйаб'яднаньню—110 і Поліграфаб'яднаньню—75 чалавек. Усе фабзавучы атрымалі кантрольныя лічбы, але большасьць з іх ня выканана.

Інспэктар кадраў ВСНГБ тав. Бэдымэрман тлумачыць гэта тым, што Наркампрацы ня прыняў належных мер да вярбоўкі ў фабзавучы. Аднак, сам ВСНГБ зрабіў ня больш, чым Наркампрацы.

Мы лічым такое становішча нецярпімым і патрабуем прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве ліпеньскага набору.

Брыгада „Ч. З." Гольдзін, Рэцкая, Слюшчын.

Белкоопсаюз „абяцае"

Адміністрацыя Віцебскага ФЗВ кулінараў умовілася з Белкоопсаюзам аб прадстаўленьні ёй інтэрнату і добрага памяшканьня з такім разьлікам, каб у асеньні набор набраць 70 чалавек.

Аднак, Белкоопсаюз сваіх абяцаньняў ня выканаў. Школа засталася без інтэрнату. Такім чынам, асеньні набор можа быць сарваны, неабходна прыняць тэрміновыя захады. **Д. С—кі.**

Набор сарваны, а Мэталяаб'яднаньне спакойна

Ліпеньскі набор па Мэталяаб'яднаньню сарваны, аб гэтым зусім спакойна расказаў нам аддзел кадраў Мэталяаб'яднаньня.

Аднак, падрыхтоўка да асеньняга набору таксама знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Павінна быць прынята ў Менскі фабзавуч—100 асоб, Бабруйскі 35, Магілеўскі—125, Віцебскі—150 і Гомельскі—175 асоб. Заняткі павінны распачацца з 15-га жніўня. Між тым, большасьць школ ФЗВ зусім не падрыхтаваны да набору.

Так, Гомельскае аддзяленьне Белдзяржбуду да гэтага часу не распачала будаўніцтва ўласнага памяшканьня для школы, тлумачачы гэта аб'ектыўнымі прычынамі. Тормозіць падрыхтоўку да навучальнага году і ВСНГБ, які ня выдае адпушчаных сродкі на капітальнае будаўніцтва, вызначаных яшчэ ў першым квартале. У выніку гэтага зрываецца капітальнае будаўніцтва ФЗВ у Гомелі, Бабруйску і іншых гарадох.

Такім чынам, адсутнасьць памяшканьня ставіць і асеньні набор пад пагрозу зрыву.

Усе фабзавучы дрэнна забясьпечаны выкладчыкамі, у асаблівасьці па спэцыяльных прадметах.

Часу засталося мала. Патрэбна да 15-га жніўня адрамантаваць усе памяшканьні з такім разьлікам, каб сустрэць новы набор падрыхтаванымі.

Брыгада „Ч. З." Канончык, Зысман.

Інспэкцыя працы павінна ведаць

Шэраг падлеткаў Быхаўскага раёну падалі заявы ў школы ФЗВ, але інспэкцыя працы гэтыя заявы хавае пад сукном.

А між тым, ліпеньскі набор у большасьці школ сарваны. Калі мы зьвярнуліся да інспэкцыі, дык атрымалі адказ: „мы нічога ня ведаем". Райком ЛКСМБ таксама „нічога ня ведае". Нас цікавіць пытаньне, хто-ж нарэшце адказвае за падрыхтоўку кадраў праз ФЗВ, і хто аб гэтым ведае? **Любаеў**

Больш гнуткасьці, опэрацыйнасьці

Да новага навучальнага году школы ФЗВ Белшвейаб'яднаньня прыходзяць непадрыхтаванымі. Заняткі з новым наборам павінны былі пачацца з 15-га ліпеня, аднак, Наркампрацы да гэтага часу ня скончыў укамплектаваньне школ.

Белшвейаб'яднаньне скараціў выпрацаваныя кантрольныя лічбы набору са 110 да 100 чалавек.

Ня лепш абстаіць справа з падрыхтоўкай да асеньняга набору, фабзавучы не забясьпечаны жыльлёвай плошчай.

Наркампрацы павінен наладзіць больш гнутка, апэрацыйна сваю працу, а Белшвейаб'яднаньне падрыхтавацца да асеньняга набору.

Брыгадзір „Ч. З." К. і З.

Скарыстаць вагоннае дэпо

З-за адсутнасьці памяшканьня амаль сарваліся веснавы і ліпеньскі наборы ў Жлобінскай школе ФЗВ.

Аднак, да асеньняга набору мы прыходзім з тым-жа прарывам — ня маем памяшканьня.

„Чырвоная Зьмена" ўжо ня раз пісала аб неабходнасьці скарыстаньня старога вагоннага дэпо, які знаходзіцца побач з фабзавучам і ні кім не скарыстоўваецца.

Невырашэньне гэтага пытаньня, безумоўна, сарве асеньні набор.

Мы патрабуем умяшальніцтва ЦКК-РСІ, якая павінна спыніць ведамсьцевую цяганіну за памяшканьне, якая цягнецца на працягу некалькі год.

М. В.



Ліпеньскі набор у ФЗВ, па прыкладу зімовага зрываецца

Малюнак скарыстоўваем другі раз

НЕ ДАМО ХАВАЦЬ!

Дэкада рэалізацыі пазыкі на вёсцы

У БОЙ ЗА СТО ПРОЦАНТАЎ

Тры дні ўдарнай дэкады ня далі належнага пералому ў рэалізацыі пазыкі на вёсцы

Канкрэтных вінавайцаў прарыву—да адказнасьці

„АДСТАЮЧЫХ Б'ЮЦЬ" (Сталін)

На 15 ліпеня рэалізавана пазыка трэцяга, рашаючага на вёсцы па кантрольных лічбах на:

Узьдзенскаму раёну	0,8	проц.
Цэрахоўскаму	„ 1,3	„
Жлобінскаму	„ 1,7	„
Рэчыцкаму	„ 2,0	„
Хойніцкаму	„ 2,7	„
Сураскаму	„ 2,7	„
Заслаўскаму	„ 2,8	„
Дубровенскаму	„ 3,1	„

Усяго па вёсцы па БССР 16,6%

ПРЫКЛАД БАРАЦЬБЫ

Клімавіцкі раён	115,4	проц.
Койданаўскі	„ 101,7	„
Пухавіцкі	„ 90,0	„
Лепельскі	„ 70,0	„
Менскі	„ 63,1	„

Перавыканалі заданьне

Самахвалавіцкі сельсавет Менскага раёну рэалізаваў пазыку „3-га рашаючага" на 30 тысяч рублёў, ахапіўшы падпіскай усіх колгасьнікаў і адзіналічнікаў. Заданьне было у 24800 рублёў.

Гэтая перамога дасягнута дзякуючы популярызацыі значэньня пазыкі сярод шырокіх колаў працоўных мас і мобілізацыі увагі усёй грамадзкасьці на выкананьне заданьня. **Вэрнікоўскі**

„Шлях колектывізацыі" паказвае прыклад

Падпіска на пазыку 3-га, рашаючага шырока разгарнулася у саўгасах, колгасах і вёсках Слуцкага раёну.

Першым па распаўсюджваньні пазыкі ідзе Івана-Агароднікі сельсавет, тут колгасьнікі колгасу „Шлях колектывізацыі" падпісаліся на суму складаючую 10 працадзён, адзінаасобнікі па 20 рублёў на кожны двор.

Акрамя гэтага, колгас „Шлях колектывізацыі" падпісаўся дадаткова на 500 рублёў і выклікаў колгасы „Трактар", „Новае жыцьцё", „Комінтэрн", „Домбаль" і „Комбайн". **Новік.**

ДАПАМАГЧЫ АДСТАЮЧЫМ КОЛГАСАМ,

комсамольскія, прафсаюзныя організацыі гораду і мястэчак павінны сваёй дапамогай узьнімаць тэмпы ўборачнай

Да уборкі збожжавых у Старадарожскім р-не падрыхтаваліся

Наладзіць узаемадапамогу адстаючым колгасам

Сенаўборка па Стара-Дарожскаму р-ну канчаецца. Кончылі ўборку колгасы: „Шлях Ільіча"—104 га сена, „Новы Дрычын"—97 га, „Шлях Леніна"—69 га, „Комуна"—260 га і г. д.

Ня выканалі свайго плану тэрмін, адстаючы у касьбе колгасы „10-годзьдзе Кастрычніка", „Герой працы", „Бальшавік". Апошняму патрэбна ўбраць сена 270 га, а скошана толькі 61 га.

Прычынамі, што даволі гэтыя колгасы дазрываў сенаўборкі, зьяўляецца адсутнічаньне працадысцыпліны, дрэнная расстаноўка рабочае сілы, адсутнічаньне правільнага ўліку працадзён.

Профсаюзная організацыя і комсамольскія ячэйкі не дапамагаюць колгасам у правядзеньні ўборкі. Яшчэ дагэтуль ніводная брыгада ня выяжджала на працу ў колгас, а пастаноў аб гэтым вынесена шмат.

Перадавыя колгасы, якія з посьпехам скончылі сенаўборку, павінны дапамагчы адстаючым. Профсаюз, комсамол Старых-Дарог, колгасы чакаюць вашай дапамогі ў скончэньні сенаўборкі і пасьпяховым правядзеньні ўборкі ўраджаю.

М. Просты.

Комсамольцы Пацей і Балвановіч зрываюць сенаўборку

Па Ябыльскаму сельсавету (Стара-Дарожскі р-н) уборка сенажаці скончана. Толькі адзін колгас „Вольны Пролетары" цягнецца ў хвасьце. Скошана і ўбрана толькі палова сенажаці.

Комсамольская ячэйка гэтага колгасу ня прыняла ніякіх мер па ўмацаваньню тэмпаў ўборкі. Асобныя комсамольцы ня выходзяць на работу ў колгас. Комсамолка Пацей Алеся за адмаўленьне ісьці працаваць на поле атрымала ад праўленьня суровую вымову, але да гэтага часу на працу ня выходзіць. Таксама шмат прагулаў у Балвановіча Івана.

Уборка збожжа па колгасах і індывідуальнаму сэктару с-с распачата 5 дзён таму назад. Колгасы заўчасова падрыхтаваліся да ўборкі ўраджаю. Адрамантавалі ўвесь уборачны інвэнтар і машыны. Падрыхтаваны будынкі для ўраджаю.

Дубец

Увязаць барацьбу за тэмпы ўборачнай з барацьбой за шматмільённы

На Хоцімскаму раёну на зьдзельшчыну перайшло 73 колгасы.

Рад колгасаў перавёў працу на зьдзельшчыну формальна. Фактычна працуюць пераважна падзённа. Напрыклад, колгас „Шоэр" лічыць, што ён перайшоў на зьдзельшчыну, але работа праводзіцца падзённа.

Колгас „Вольная праца" вынес пастанову перайсьці цалкам на зьдзельшчыну. Прыняты нормы выпрацоўкі. Але пастанова засталася невыкананай. На працягу ўсяго часу касьба і ўборка праходзяць падзённа.

У тых колгасах, дзе меецца частковая зьдзельшчына, вельмі дрэнна настаўлена барацьба за якасьць працы.

Комсамольская організацыя не ўвязала барацьбу за тэмпы ў сенаўборачнай кампаніі з ростам комсамолу. Трэўціцкі сельсавет колектывізаваны на 95 проц., у ім налічваецца 5 колгасаў. У сельсавеце маецца толькі адна ячэйка пры колгасе „Новы шлях". У чатырох астатніх колгасах ячэек і комсамольцаў няма. У Дубраўскім сельсавеце 2 колгасы. Комсамольскай ячэйкі няма ніводнай.

Трэба комсамольскай організацыі Хоцімшчыны паставіць работу так, каб увязаць барацьбу за пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі з барацьбой за замацаваньне колгасу, за шпаркі рост комсамольскай організацыі ў колгасах.

Н. Ясна.

Ударнымі тэмпамі

ВІЦЕБСК. Колгас „Новы Сьвет" 18-га чэрвеня прыступіў да ўборкі сенажаці. На сенажаці кожны дзень працуе дзьве касілкі у брыгаде касцоў у 30 асоб.

Па вытворчаму пляну колгасу патрэбна скасіць сенажаці 181 га, вікі—108,5 га і інш. На 25-е чэрвеня колгасам скошана 30 га сенажаці 1 га вікі. Прыбрана і складзена у хлеў 10 тон сена.

Уся работа ў колгасе праводзіцца на аснове зьдзельшчыны з улікам працадзён кожнага колгасьніка па колькасьці і якасьці работы. Правільная організацыя працы зьяўляецца парукай пасьпяховага выкананьня вытворчай програмы колгасу.

Давід С—кі

Выпушчаем насьценгазэту на полі

Па-ўдарнаму ідзе сенаўборка ў колгасе „Новае Жыцьцё" Азінцкага сельсавету (Барысаўскі раён). За чатыры дні скошана 20 га сенажаці, складзена ў стагі 5000 пудоў сена.

Добра працуюць брыгады касцоў. Норма, вызначаная 0,20 га, перавыконваецца. У першы дзень касьбы, брыгады скошвалі на 0,25, а наступных на 0,32 і больш га.

Для колгасьнікаў організавана грамадзкае харчаваньне на полі. Тут-жа на полі выпушчаецца і насьценгазэта, якая дае добрых ударнікаў і ўказвае гультаёў сенаўборкі.

П. К.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БАЯВУЮ РАБОТУ КОМСАМОЛА
У РАБСЕЛЬВАЕНКОРАЎСКІМ РУХУ

Кожная ячэйка і камітэт у адказе за рэалізацыю рашэньняў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў

Рашэньні 2-га ўсебеларускага рабсельваенкораўскага зьезду зьяўляюцца вялікім укладам у перабудову работы друку рабсельваенкораўскага руху і кіраўніцтва ім. Задача ўсіх нашых організацый—забясьпечыць неадкладную рэалізацыю гэтых рашэньняў у шырокіх масах рабсельваенкораў, рабочых, колгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства.

Таксама гэтыя матар'ялы і рашэньні кладуць вялікія абавязкі і на комсамольскія організацыі. Комсамольскія ячэйкі і камітэты абавязаны неадкладна разгарнуць работу па прапрацоўцы гэтых рашэньняў, у першую чаргу ў комсамольскай організацыі, і па азнаямленьню з імі шырокіх працоўных мас. Уся гэта работа павінна быць падпарадкавана правядзеньню чарговых гаспадарча-палітычных кампаній з тым, каб забясьпечыць бальшавіцкія тэмпы, размах і якасьць перабудовы рабсельваенкораўскага і юнкораўскага руху адпаведна задачам разгорнутага соцыялістычнага наступленьня па ўсяму фронту.

Рашэньні зьезду—у масы

З пастановы сэкратарыяту ЦК КП(б)Б

а) Даклады аб выніках зьезду заслухаць на агульна-гарадзкіх і раённых сходах партыйнага актыву, на адкрытых сходах партыйных і комсамольскіх ячэек, а таксама на сходах профсаюзнага і комсамольскага актыву.

б) На спэцыялізаваных сходах рабселькораў разам з рабочымі і колгасьнікамі (па групах вядучых профэсій, па групах жывёлагадоўчых, па групах ільнаводчых саўгасаў і колгасаў і г. д.) прапрацаваць пастановы адпаведных сэкцый зьезду. Забясьпечыць удзел у прапрацоўцы спэцыялістых, гаспадарнікаў і профработнікаў.

в) У часе кампаніі прапрацоўкі вынікаў зьезду неабходна організацыйна замацаваць умову з друкам і рабселькорамі УССР аб соцыялістычным спаборніцтве на поўнае і найбольш хуткае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16-га красавіка 1931 г., пастаноў усесаюзнай нарады пры „Праўдзе" і другога ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

г) У лютым 1932 году разам з ЦКК КП(б)Б правесьці ўсебеларускі месячнік масавага агляду самаправеркі выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) ад 16 красавіка, пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў і ўсесаюзнай нарады пры „Праўдзе".

Кіраўніцтву Камвузу імя Леніна, ўсебеларускай саўпартшколы і політэхнікуму ўдасканаліць тэрмін праходжаньня навучальнай програмы газэтных аддзяленьняў, выходзячы з таго, што ў лютым 1932 г. студэнты газэтных аддзяленьняў будуць накіраваны на месяц у раёны БССР для дапамогі парторганізацыям у правядзеньні масавага агляду самаправеркі.

д) Прапрацаваць пастановы ўсебеларускага зьезду рабселькораў і ўсесаюзнай нарады пры „Праўдзе" ва ўсіх зьвеньнях сыстэмы партыйнай і комсамольскай асьветы.

Культпропу ЦК КП(б) і ЦК ЛКСМБ даць аб гэтым адпаведныя паказаньні.

Абавязаць БДВ пад адказнасьць т. т. Некрашэвіча і Брэнэйзіна ў дзкадны тэрмін выдаць масавым тыражом зборнік пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў.

Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і раённых шматтыражак і насьценных газэт зьмяшчаць пастаянныя аддзелы па пытаньнях барацьбы за ажыцьцяўленьне пастаноў усебеларускага зьезду рабселькораў.

Пэрыядычна праводзіць опэрацыйна-масавую работу (рэйды нарады і г. д.) па праверцы выкананьня пастаноў зьезду і ў асаблівасьці пастаноў тэй сэкцыі, якою ў часе зьезду кіравала адпаведная цэнтральная або раённая газэта.

Усім ГК і РК КП(б)Б

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б завастрае асаблівую ўвагу ўсёй КП(б)Б, усіх гарадзкіх і раённых камітэтаў КП(б)Б на неабходнасьці забясьпечыць сыстэматычнае, глыбокае замацаваньне і далейшае разгортваньне тэй работы па перабудове рабселькораўскага руху і нізавога друку, якая была праведзена ў часе падрыхтоўкі да ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

У прыватнасьці неабходна безадкладна выканаць паказаньне ЦК УсеКП(б) аб тым, што „для кіраўніцтва рабселькорамі і нізавым друкам пры партамітэтах павінны быць створаны камісіі ў складзе загадчыка культпропаддзелам, рэдактара газэты, прадстаўніка РСІ, прокуратуры і інструктара па друку, а пры культпропах буйнейшых РК вылучаны інструктары друку".

Цэнтральны Камітэт КП(б)Б ускладае на раённыя і гарадзкія камітэты КП(б)Б непасрэдную адказнасьць за організацыю масавай прапрацоўкі і кіраўніцтва практычным ажыцьцяўленьнем пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху і прынятых на падставе гэтага дакументу пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў.

Сэкратар Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б Гей.

Загадчык Культпропу ЦК КП(б)Б Чарнушэвіч.

З пастановы ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў па дакладах т. т. Будзінскага і Курціка

Другі ўсебеларускі зьезд рабсельваенкораў, заслухаўшы даклады т. т. Будзінскага і Курціка па пытаньню рабселькораўскага руху, партыйнага кіраўніцтва ім і ўдарніцтва ў друку, а таксама паведамленьне аб рабоце 14-ці сэкцый усебеларускага зьезду рабсельваенкораў,—пастанаўляе:

1. Далучыцца да пастаноў апошняй усесаюзнай нарады па пытаньню рабселькораўскага руху пры „Праўдзе", улічваючы, што конкрэтныя задачы рабселькораў БССР па паасобных важнейшых галінах народнай гаспадаркі БССР вызначаны ў пастановах сэкцый усебеларускага зьезду рабсельваенкораў.

2. Распрацаваныя ў 14-ці сэкцыях усебеларускага зьезду рэзолюцыі з усімі прынятымі сэкцыямі дадаткамі і зьменамі—зацьвердзіць. Констатаваць, што ў распрацоўцы і абгаварэньні проекту рэзолюцыі сэкцый зьезду, прыняла непасрэдны актыўны ўдзел 90 проц. агульнай колькасьці дэлегатаў зьезду.

3. Забясьпечыць безадкладную масавую і грунтоўную прапрацоўку пастаноў 2-га ўсебеларускага зьезду рабсельваенкораў, а таксама пастаноў усесаюзнай нарады пры „Праўдзе" на спэцыялізаваных зьлётах рабсельваенкораў па асобных профэсіях, з шырокім прыцягненьнем спэцыялістых, гаспадарнікаў і профработнікаў.

З дакладу т. Будзінскага на 2-м усебеларускім зьезьдзе рабсельваенкораў

За ленінскае разуменьне ролі бальшавіцкага друку

—У падыходзе да пытаньняў друку бальшавікі адрозьніваліся ад іншых рэволюцыйных соцыял-дэмократаў (на прыклад СД КПіЛ) тым, што у той час, калі рэволюцыйныя соцыял-дэмократы неадацэньвалі або не заўважвалі значэньня друку, як організуючага фактара, разглядалі друк выключна, як зброю пропаганды, як зброю агітацыі, бальшавікі з першага моманту свайго існаваньня клалі націск у роўнай ступені і на організатарскую ролю друку.

Опортуністам зьяўляецца той, хто лічыць, што работнік друку—я гэта разуменьне ўжываю у самым шырокім значэньні гэтага слова, значыцца гавару ня толькі аб профэсыянальных работніках друку, але аб усёй рабселькораўскай масе,—што работнікі друку выключна агітатары, выключна пропогандысты, выключна сыгналізатары або выключна крытыкі і выкрывальнікі. На гэтым пункце гледжаньня стаяць правыя опортуністыя, на чале якіх стаяў у свой час і тав. Бухарын. Вядома гэта ацэнка ролі друку і работнікаў друку нічога супольнага ня мае з сапраўднасьцю і з ўстаноўкамі нашай партыі.

Наш бальшавіцкі друк заўсёды быў друкам рабочае клясы і для рабочае клясы. У стары час, у час нашага падпольля, ды і зараз яшчэ у краінах капіталу ёсьць надзвычай многа друкаваных органоў буржуазіі і дробнай буржуазіі якія прызначаны для рабочае клясы: якія падрабляюцца пад мову рабочае клясы, прабуюць стварыць ўражаньне, што яны стаяць на абароне рабочае клясы. Аднак гэтыя органы друку, як-бы яны шумна не называліся ці то „Прыяцель народу" ці то „Роботнік", ці то „Гонец волі"—усе служаць аднэй мэце; яны імкнуцца паралізаваць барацьбу рабочае клясы, адцягнуць яе ад рэволюцыйных дзеяньняў, зрабіць яе такім чынам нявольнікам капіталу. Гэты друк „для рабочага" зьяўляецца друкам найбольш варожым рабочай клясе, бо ён на справе служыць інтарэсам варожым рабочай клясе.

Твар буржуазнай „свабоды слова"

Чым зьяўляецца у сапраўднасьці буржуазная свабода слова?

На гэта пытаньне мы знойдзем вельмі поўны і вычарпальны адказ у Леніна. Гэтыя словы Леніна нам, рабкорам, колгаскорам, ваенкорам і селькорам трэба добра запамятаваць, бо ня раз больш адсталыя рабочыя альбо сялянскія масы высоўваюць перад намі гэтыя пытаньні.

Вось, як Ленін характарызаваў буржуазную свабоду друку:

„Паны буржуазныя індывідуалісты, мы павінны сказаць вам, што вашы прамовы аб абсолютнай свабодзе адна крывадушнасьць. У грамадзтве, аснованым на ўладзе грошай, у грамадзтве, дзе масы працоўных цярпяць нэндзу і жменька багатыроў туняднічае, ня можа быць „свабоды" рэальнай і сапраўднай. Ці вольны вы ад вашага буржуазнага выдаўцы, пан пісьменьнік? Ад вашай буржуазнай публікі, якая патрабуе ад вас порнаграфіі ў рамках і малюнках, простытуцыі ў выглядзе „дадатку" да „сьвятога" сцэнічнага мастацтва? Але-ж гэта абсолютная свабода ёсьць буржуазная ці анархічная фраза (бо як сьветапогляд, анархізм ёсьць перавернутая на другі бок буржуазнасьць). Жыць у грамадзтве і быць свабодным ад грамадзтва нельга. Свабода буржуазнага пісьменьніка, мастака, актрысы ёсьць толькі замаскаваная (ці крывадушна замаскаваная) залежнасьць ад грашовага мяшка, ад подкупу, ад утрыманьня" (Ленін, том VII. ч. 1-я. стар. 25).

Гэтыя фармулёўкі Леніна, выказаныя ў 1905 г., знайшлі яшчэ больш яскравае выражэньне ў 1921 г. у тэзісах Леніна аб буржуазнай дэмократыі і дыктатуры пролетарыяту. З вялізарным сарказмам Ленін зрывае ў сваіх тэзісах маску з буржуазнай свабоды друку:

... „Свабода друку" таксама служыць адным з галоўных лёзунгаў „чыстай дэмократыі". Тым ня менш рабочыя ведаюць, а соцыялісты ўсіх краін прызнавалі гэта мільёны разоў, што гэта свабода—зман да таго часу, пакуль лепшыя друкарні і самыя вялікія запасы паперы будуць знаходзіцца ў руках капіталістаў, а ўлада капіталу будзе працягваць панаваць над прэсай, тая ўлада, якая праяўляецца ва ўсім сьвеце тым ясьней, рэзчэй і цынічней, чым больш разьвітымі аказваюцца дэмократызм і рэспубліканскі рэжым, як, напрыклад, у Амэрыцы" (Ленін, том XVI, стар. 39-40).

Таварышы, гэту свабоду друку па-буржуазнаму лепш за ўсё адчуваюць нашы замежныя таварышы.

Наш комуністычны друк за граніцай павінен весьці барацьбу ня толькі супроць цэнзуры, але і супроць магутных буржуазных концэрнаў, якія кідаюць у рабочыя прадмесьці мільёныя экзэмпляры жоўтага друку пад самымі „чырвонымі" загалоўкамі і за самую таннюю плату.

Буржуазны друк добра служыць сваёй клясе і мы невыпадкова, экспрапрыюючы экспрапрыятараў, у 1917 г. скасавалі права на існаваньне буржуазнага друку. Гэты друк, як казаў тав. Ленін пасьля кастрычніка 1917 г., быў бомбай ілжы, дапаўняючай бомбы Каледзіна: „Мы ня можам—казаў т. Ленін, да бомб Каледзіна дадаваць бомбы ілжы. Мы ня можам дапусьціць, каб на франтох грамадзянскай вайны паміралa лепшая частка рабочай клясы ад зброі, і каб унутры краіны атручвалі рабочую клясу ілжой буржуазнага друку.

„Свабода" друку буржуазіі—свабода хлусьні, свабода атручваньня працоўных мас

Паглядзеце, таварышы на твар буржуазнага друку. Разглядзеце ў чым сутнасьць гэтай бомбы ілжы?

Адказ ясны. Буржуазнаму друку рабочыя, батракі і бедзякі ня вераць. Для іх наша будаўніцтва зьяўляецца лепшым прыкладам барацьбы за соцыялізм і шляхаводнай зоркай. Вось чаму яны кідаюць бомбы хлусьні аб тым, што быццам тав. Сталін—правадыр сусьветнага пролетарыяту, якому вы, заходнія таварышы, верыце, гаворыць аб абмежаваньні заваяваных пролетарыятам правоў. Сэнс гэтай хлусьні зводзіцца да таго, каб перакапаць рэволюцыйныя масы Захаду, якія пачынаюць усё больш бунтаваць у сувязі з крызісам і беспрацоўем, што ўсе шляхі вядуць, урэшце да абмежаваньня правоў пролетарыяту, нават калі ён заваюе сабе панаваньне. Буржуазны друк і яго тэлеграфныя агенцтвы ў момант разгортваньня крызісу капіталістычнай сыстэмы прабуюць паралізаваць волю да барацьбы рабочых мас указаньнем, што і ў Савецкім Саюзе мае месца банкруцтва соцыялістычнай гаспадаркі, банкруцтва пролетарскага мэтоду гаспадарчага будаўніцтва.

Соцыял-фашысцкі друк—лёкай капіталізму

Неабходна пазнаёміцца, для чаго служыць буржуазная свабода слова меншавіком соцыял-фашыстам. Соцыял-фашысты прабуюць перакапаць рабочых Захаду сьледам за буржуазным друкам, што няма для чаго рабіць рэволюцыі, бо кожная рэволюцыя канчаецца контр-рэволюцыяй.

За апошні час у радох ворагаў пролетарскай рэволюцыі зьявіліся і новыя фігуры.

На старонках буржуазнага друку гарцуе Леў Троцкі, у мінулым меншавік з ультра-левымі загібамі, потым чалавек, які ішоў каля нашай партыі даволі доўгі час, гадоў дзесяць з дня Кастрычніцкай рэволюцыі. Зараз гэты рэнэгат, выкінуты з Савецкага Саюзу вярнуўся ў бацькаўскі дом буржуазіі і паказаў свой твар.

Свабода друку па-буржуазнаму служыць буржуазіі і яе агентам і саюзьнікам—соцыял-фашыстам і контррэволюцыйным троцкістым для закабаленьня рабочае клясы, для таго, каб паралізаваць яе волю да барацьбы.

Мы выступаем супроць усякіх спроб зацiснуць пролетарскую самакрытыку і рашуча заціскаем і адбіраем свабоду контр-рэволюцыйнай агітацыі.

Яны ў краінах капіталу заціскаюць пролетарскую крытыку, заціскаюць і адбіраюць у нас свабоду рэволюцыйнай агітацыі, даючы поўную свабоду соцыял-фашысцкім і рэнэгацка-троцкісцкім паклёпам супроць пролетарыяту і яго партыі.

У той самы момант, калі мы амаль у 20 раз за гэтыя два гады памножылі колькасьць рабсельваенкораў, калі мы замест 15 друкаваных газэт, што выходзілі два гады таму назад, маем сёньня 57 друкаваных газэт з вялізарным мільёнавым тыражом 150 фабрычна-заводзкіх шматтыражак з тыражом каля 100 тыс. экзэмпляраў, у той час як наш друк свабодна організуе рабочую клясу і бядняцка-серадняцкія масы вёскі на будаўніцтва соцыялізму на ўмацаваньне дыктатуры пролетарыяту, у гэты час у Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіне пролетарскі друк забаронен, рэволюцыйныя пролетарскія організацыі загнаны ў падпольле.

Ні адна газэта, якая сапраўды стаіць на варце інтарэсаў рабочае клясы і працоўных мас вёскі фашысцкай Польшчы ня існуе легальна. Органы компартыі яе лістоўкі выдаюцца і распаўсюджваюцца нелегальна. За распаўсюджваньне комуністычных лістовак, якія заклікаюць да забастовак, да салідарнага падтрыманьня бастуючых рабочых рабочымі небастуючых прадпрыемстваў, палітычных дэмострацый і выступленьняў, фашысцкія суды прыгаворваюць да шмат гадоў катаржнай турмы. Нават дзяцей і моладзь 16-17 год фашысцкія суды за распаўсюджваньне комуністычных, або комсамольскіх выданьняў прысуджваюць да 4-6 год катаржнай турмы. У часе арышту і пры допыце гэту моладзь жорстка зьбіваюць у турме трымаюць яе у такіх ўмовах, што пасьля скончаньня тэрміну прыгавору гэта моладзь з турмаў выходзіць інвалідамі.

Такія прасьледваньні пралетарскай або лева-сялянскай прэсы маюць месца на усім абшары Польшчы. Асабліва лютуе фашысцкі тэрор супроць пролетарскага лева-сялянскага і нацыянальна-вызвалечага друку на акупаваных тэрыторыях Заходняй Беларусі і Зах. Украіны.

Буржуазія забараняе кожную газэту якая рашуча ставіць пытаньне аб барацьбе працоўных і эксплёатаваных мас за іх соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Сялянскія масы пад кіраўніцтвам пролетарыяту, прабуюць стварыць свой друк, які пропогандуе лёзунг „зямля—сялянству бяз выкупу" дзе яны пішуць, што гэту зямлю бядняцка-серадняцкія масы могуць здабыць толькі у саюзе і пад кіраўніцтвам рабочае клясы, у барацьбе супроць буржуазіі і кулацтва. Даволі гэту фразу напісаць або даволі напісаць такі артыкул, ў якім паміж радкоў прасьвечваліся-б гэтыя лёзунгі, каб газэта канфіскавалася, а рэдактар адпраўляўся у турму. Толькі на працягу аднаго 1927 г. лева-сялянская нацыянальна-вызвалечая газэта Зах. Беларусі семнаццаць раз закрывалася. У сувязі з гэтым 17 чалавек рэдактароў былі прыгавораны да турэмнага зьняволеньня ад пал. года да 3 год. Колькасьць конфліктаў і штрафаў літаральна нельга падлічыць. За гэты год газэта канфіскавалася ня менш 50 раз і прыгаварвалася да штрафаў ня менш чым 100 раз. Нарэшце фашысцкі ўрад і гэту газэту закрыў, забараніўшы друкарням прымаць у работу лева сялянскія газэты. нават пры існаваньні фармальнага дазволу з боку фашысцкай ўлады на выданьне іх.

Вось вам малюнак свабоды друку па-буржуазнаму.

* * *

У другой частцы свайго дакладу тав. Будзінскі падрабязна спыніўся на задачах рабселькораўскага руху, цэнтральнага і нізавога друку на задачах разгортваньня пролетарскай самакрытыкі.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўліт ел № 599